

Малая радзіма Барысаўскі раён

Ліліяна Анцух

# ЗЕМБІН

## Кароткі экскурс у гісторыю і сучаснасць. Жыццяпіс зембінцаў

МІНСК

ВЫДАВЕЦТВА «ЧАТЫРЫ ЧВЭРЦІ»
2023

УДК 94(476.1-221 Зембин)
ББК 63.3(4Беи)
А74

Серыя заснавана ў 2015 годзе

Рэдакцыйны савет:
*Алесь Карлюкевіч, Зіновій Прыгодзіч, Міхась Мацельскі, Алена Капыток,
Аляксандр Балябін, протаіерэй Андрэй Капульцэвіч, Галіна Ігнатовіч, Ліліяна Анцух*

Прадмовы:
*А. М. Карлюкевіч,*
*З. К. Прыгодзіч*

**Анцух, Л. Ф.**
А74 Зембін : кароткі экскурс у гісторыю і сучаснасць. Жыццяпіс зембінцаў / Ліліяна Анцух ; прадм.: А. М. Карлюкевіч, З. К. Прыгодзіч. — Мінск : Чатыры чвэрці, 2023. — 164 с. : іл.; [8] л. укл. — (Серыя «Малая радзіма. Барысаўскі раён»).
ISBN 978-985-581-499-4.

Выданне мае на мэце папоўніць скарбніцу ведаў пра старажытнае мястэчка Барысаўшчыны (цяпер аграгарадок) — Зембін. Са старонак гэтай кнігі ён упершыню паўстае перад чытачом, пачынаючы ад XVI стагоддзя і да сённяшняга часу. Для паселішча і яго жыхароў ніводнае стагоддзе не было зацішным: нашэсці, войны нанеслі шмат незаменных страт. На працягу апошніх значна пацярпела найпрыгажэйшая Свята-Міхайлаўская царква, разбурыўся велічны касцёл Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі, які быў апошнім у Беларусі, узведзеным у стылі барока. Вялікая Айчынная вайна забрала сотні жыццяў. Аднак у мірны час зембінцы здолелі адрадзіць гаспадарку, умацаваць дабрабыт, стварыць культурнае і духоўнае асяроддзе.

Асновай для навукова-папулярнага аповеда аўтару паслужылі дакументальныя і архіўныя крыніцы, навуковыя публікацыі, успаміны відавочцаў падзей, гутаркі з сучаснікамі, матэрыялы са сродкаў масавай інфармацыі.

Кніга будзе карыснай усім, хто мае непасрэднае дачыненне да Зембіна, а таксама краязнаўцам, супрацоўнікам музеяў, экскурсаводам, бібліятэкарам, выкладчыкам вучэбных устаноў, настаўнікам сярэдніх школ.

**УДК 94(476.1-221 Зембин)**
**ББК 63.3(4Беи)**

**ISBN 978-985-581-499-4**

© Анцух Л. Ф., 2023
© Карлюкевіч А. М., прадмова, 2023
© Прыгодзіч З. К., прадмова, 2023
© Афармленне. ТДА «Выдавецтва “Чатыры чвэрці”», 2023

# Звяртаючыся да родных каранёў…

Краязнаўчай літаратуры ў апошнія дзесяцігоддзі выдадзена даволі шмат. Ёсць прыклады, калі кнігай становіцца плён шматгадовай дзейнасці настаўніка гісторыі ці беларускай літаратуры па вывучэнні краю, паселішча, дзе ён жыве. Ёсць прыклады, калі апісаннем, даследаваннем роднай старонкі займаецца яе ўраджэнец, які праз гады спрычыніўся да гістарычнай памяці, вырашыў такім чынам аддаць даніну павагі землякам, мясцовасці, якая яго выпеставала. Часам і прафесійныя гісторыкі, займаючыся, напрыклад, тэмай даволі далёкай ад рэгіёназнаўства, не шкадуючы часу, уніклівa падыходзяць да вывучэння роднай старонкі… Вялікіх прыкладаў такой захопленасці вывучэннем гісторыі роднай мясціны ў Беларусі, на шчасце, даволі шмат. Дастаткова згадаць імёны доктара гістарычных навук Генадзя Каханоўскага, які, маючы навуковы багаж, займаючыся плённа і археалогіяй, і іншымі галінамі гісторыі і літаратуразнаўства, не цураўся працы над кнігамі пра Вілейку і Маладзечна, доктара філалагічных навук Адама Мальдзіса, які знайшоў час, каб зрабіць кнігу нарысаў пра родную Астравеччыну. А яшчэ нельга не сказаць пра руплівасць многіх пісьменнікаў, якія шмат зрабілі ў справе збірання звестак пра малую радзіму. У кожнага з іх розны вопыт, але тым не меней плён іх здзяйсненняў аднолькава ўражвае. Як «выхаджаныя» нагамі нарысы лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Яраслава Пархуты, як кнігі пра Случчыну, Капыльшчыну, Драгічыншчыну лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Алеся Марціновіча, як падарожныя кнігі забытага выдаўцамі Леаніда Пракопчыка, краязнаўчую публіцыстыку якога даўно варта перавыдаць, як зборнікі нарысаў пра беларускія мястэчкі Мар'яна Віжа…

Мне добра знаёма гістарычнае крыніцазнаўства па Пухавіцкім раёне, краязнаўства Пухавіччыны. І надзвычай радуюся, што з года ў год у працу па вывучэнні Мар'інай Горкі і яе ваколіц прыходзяць новыя і апантаныя людзі. Калі ў сярэдзіне XX стагоддзя, у апошнія дзесяцігоддзі мінулага стагоддзя пухавіцкім краязнаўствам займаліся заслужаны



настаўнік БССР Віктар Арлоў, настаўнік гісторыі Гарэлецкай васьмігадовай школы Сяргей Сіпач, літаратуразнаўца і дзіцячы пісьменнік Браніслаў Зубкоўскі, журналіст Анатоль Ярохін, бібліятэкар Аляксандр Пікулік, то ўжо ў 1990-я і пазней, у новым стагоддзі, да вывучэння розных паселішчаў спрычыніліся дырэктар Пухавіцкага раённага краязнаўчага музея Аляксандр Прановіч, настаўніца Наталля Вайцяховіч, журналіст і кнігавыдавец Віктар Хурсік, доктар фізіка-матэматычных навук Уладзімір Паўловіч, настаўніца Наталля Ільініч… Я не назваў і паловы тых апантаных, выключна творчых людзей, якія нераўнадушна паставіліся да захавання гістарычнай памяці. Пэўна, і ў Барысаве, на Барысаўшчыне за дзесяцігоддзі склаўся атрад, склалася кагорта даследчыкаў роднай старонкі. Мяркую аб гэтым па наведванні Барысаўскай раённай бібліятэкі імя І. Х. Каладзеева, па ўвазе бібліятэкараў да краязнаўчай работы, па згадках у рэспубліканскім друку пра Барысаў і Барысаўшчыну ў розныя часіны. А іначай і быць не можа. Барысаўскі край — культурнае гняздо Беларусі. Тут нарадзіліся і пайшлі ў вялікую дарогу вучоныя, арганізатары вытворчасці, дзеячы культуры і мастацтва, пісьменнікі… З Барысаўшчынай звязаны лёс празаікаў, паэтаў, літаратуразнаўцаў Васіля Гігевіча, Міхася Клімковіча, Гірша Камянецкага, Ізі Харыка, Алены Брава, Янкі Лайкова, Алены Капыток, Марыны Помаз-Лайковай… Між іншым, Ліліяна Анцух спрыяе выданню творчай спадчыны пісьменнікаў-землякоў.

Вядомы ў нашай краіне кнігавыдавец і публіцыст, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Ліліяна Анцух сваім лёсам самым цесным чынам звязана з Барысавам, Барысаўшчынай. І не выпадковасцю стала адкрыццё ў яе выдавецтве «Чатыры чвэрці», якое надзвычай шмат робіць для падтрымкі сучаснай беларускай літаратуры, серыі «Малая радзіма. Барысаўскі раён». І надзвычай радасна, што ў гэтай серыі выходзіць кніга самой Ліліяны Анцух — «Зембін: кароткі экскурс у гісторыю і сучаснасць. Жыццяпіс зембінцаў». Паселішча, якое мае легендарную гісторыю, упершыню атрымлівае сваю фактычна гісторыка-краязнаўчую энцыклапедыю.

Знаёмства ўжо з першымі старонкамі кнігі паказвае, наколькі правільна і пісьменна аўтар выбудоўвае свой расповед. Ліліяна Анцух выкарыстоўвае нямала гістарычных, архіўных крыніц, многія факты ў шырокі ўжытак уводзяцца ўпершыню. Даследчыца абапіраецца і на зробленае раней у вывучэнні гістарычнай мясціны папярэднікамі. Асабліва хвалюючымі падаюцца старонкі, прысвечаныя драматычным падзеям Вялікай





Айчыннай вайны. Аўтар кнігі ўзнаўляе ў чытацкай свядомасці тыя жудасныя дзеі, якія рэльефна, выразна акрэслена характарызуюць змест такой з'явы, як генацыд.

Працу Ліліяны Анцух можна смела залічыць і да важкага здабытку ў праваслаўным краязнаўстве Барысаўшчыны і ўвогуле Беларусі. Выдатна, што і гэтыя старонкі, як, дарэчы, і ўся кніга, багата ілюстраваны. Такі падыход паспрыяе нараджэнню і турыстычнай, экскурсійнай зацікаўленасці да мясцін, якія раскрываюцца ў кнізе.

Краязнаўства, якое носіць, зразумела, рэгіёназнаўчы характар, спалучае ў самім сваім характары, у сваёй сутнасці мінуўшчыну і сучаснасць. І гэтым прынцыпам кіруецца і аўтар кнігі «Зембін: кароткі экскурс у гісторыю і сучаснасць. Жыццяпіс зембінцаў». Чытачы, якія пазнаёмяцца з выданнем, знойдуць на яго старонках сваіх родных, блізкіх, прычым не толькі далёкіх прашчураў. Ліліяна Анцух, калі піша, напрыклад, пра Зембінскую сярэднюю школу, то пералічвае амаль усіх кіраўнікоў навучальнай установы за апошнія паўвека. Падрабязна спыняецца публіцыстка і на расповедзе пра сельскую бібліятэку ў Зембіне, якая з'яўляецца філіялам Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя І. Х. Каладзеева. З кнігі мы даведваемся, што бібліятэка «збірае і назапашвае матэрыялы пра падзеі на сваёй малой радзіме — значныя і штодзённыя, пра сваіх землякоў — знакамітых асоб і простых людзей». Бібліятэка з'яўляецца краязнаўчым цэнтрам…

Кніга Л. Анцух пра Зембін і яго блізкія ваколіцы — выдатны ўнёсак у беларускую краязнаўчую літаратуру. А яшчэ — добры прыклад для кнігавыдаўцоў, як пашыраць звесткі пра рэгіёны. Такога характару памкненні — складнік патрыятычнага выхавання грамадства. Выхавання не на словах, а на справе. Вельмі хацелася б, каб зробленае Ліліянай Анцух заўважылі не толькі ў Зембіне, але і па ўсёй Барысаўшчыне. Кніга па праве можа стаць часткай курса «Барысавазнаўства» ў школах г. Барысава і Барысаўскага раёна.

***Алесь Карлюкевіч***,
*старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі і краязнаўчай секцыі СПБ,*
*лаўрэат прэміі «За духоўнае адраджэнне»,*
*Нацыянальнай літаратурнай прэміі,*
*прэміі Беларускага саюза журналістаў «Залатое пяро»*








*Аграгарадок Зембін Барысаўскага раёна Мінскай вобласці — адміністрацыйны цэнтр Зембінскага сельсавета (з 20 жніўня 1924 г.), за 28 км на паўночны захад ад раённага цэнтра і чыгуначнай станцыі Барысаў, 99 км ад Мінска. Каля аграгарадка цячэ р. Зембінка (прыток р. Гайны). Транспартныя сувязі ажыццяўляюцца па аўтадарогах Барысаў — Плешчаніцы і Лагойск — Бягомль, якія праходзяць праз Зембін.*

# ПАДАРОЖЖА Ў МІНУЛАЕ

## Жаба, Жабін, Жэбін, Зебін, Зембін

Вядомы беларускі вучоны, доктар геаграфічных навук, стваральнік тапанімічнай школы Беларусі Вадзім Андрэевіч Жучкевіч (1915–1985) сцвярджаў, што з цягам часу назва вёскі змянялася, першапачатковай формай, хутчэй за ўсё, было асабістае імя «Жаба», якое паступова трансфармавалася ў «Зембін» такім чынам: Жабін — Жэбін — Зебін — Зембін.



Зембін на Радзівілаўскай карце

Найбольш старое пісьмовае згадванне Зембіна адносіцца да 1526 г., але ёсць прыкметы, што яго гісторыя пачалася значна раней. Краязнаўца Міхась Мацельскі, напрыклад, лічыць, што ў наваколлі былога мястэчка людзі пасяліліся і жылі не адну тысячу год. Старажытнае гарадзішча, якое захавалася на беразе


Герб рода Кішкаў

прытока Гайны — р. Зембінкі, з'яўляецца бясспрэчным сведчаннем гэтаму, але даследаванні там яшчэ не праводзіліся.

З 1526 г. Зембінам валодалі Радзівілы. Для кіравання быў прызначаны дзяржаўца (у тыя часы іх размяркоўвалі толькі ў вялікакняжацкія або ў буйныя маёнткі). У ліпені 1592 г. дзяржаўцам зембінскага маёнтка быў Януш Длузскі. У гэтым годзе ў рукапісах ужо ўпамінаецца назва в. Зембін.

У XVI — першай палове XVII ст. назіраецца росквіт Зембіна, які меў статус мястэчка і належаў знакамітаму ў Рэчы Паспалітай роду Кішкаў. У 1612 г. віцебскі ваявода Станіслаў Кішка падзяліў усе свае ўладанні паміж чатырма сынамі. Зембін атрымаў старэйшы сын Станіслаў Кішка — віцебскі схаластык і сакратар польскага караля Сігізмунда III. Права на спадчыну было пацверджана запісам у кнізе Трыбунала Вялікага Княства Літоўскага.

На пачатку XVII ст. Зембін стаў уласнасцю шляхецкага роду Саковічаў, пазней мястэчкам валодала Святаслава Раецкая, другая жонка Адама Саковіча, якая пасля яго смерці выйшла замуж за Мікалая Патоцкага. Потым мястэчка адышло Пражмоўскім.

З сярэдзіны XVII ст. з-за вайны і яе наступстваў Зембін перажывае моцны заняпад. Не прынёс палёгкі і пачатак XVIII ст. Падзеі падчас руска-шведскай вайны Зембін абмінулі, але працяглае размяшчэнне тут войска на чале з графам Аляксандрам Меншыкавым негатыўна адбілася на яго стане.

У 1721 г. мястэчка мела 17 падворкаў, карчму, два вадзяныя млыны.

У 1777 г. — 38 двароў, карчма, бровар і два вадзяныя млыны.

У XVIII ст. Зембін згубіў статус мястэчка.

Пераломным у лёсе Зембіна стаў 1783 г. Храптовіч дамогся вяртання Зембіну статуса мястэчка, запрасіў сяліцца ў ім вольных людзей — як хрысціян, так і не хрысціян, стварыў усім умовы для вядзення гандлю. З гэтага часу ў ім пасяляюцца сярод іншых і яўрэі, і мястэчка пачынае хутка расці.

Пасля 1793 г. (пасля анексіі земляў у склад Расійскай імперыі) зембінскі маёнтак Храптовічаў быў секвестраваны (*гэта значыць, што дзяржавай накладзена забарона або абмежаванне на карыстанне маёмасцю*), але неўзабаве ён быў выкуплены Яўхімам

# ЗНІКЛЫЯ ВЫДАТНАСЦІ

Этнічная змена складу насельніцтва мястэчка прывяла да перамены яго выгляду. Раней на яго цэнтральнай гандлёвай плошчы стаяла царква. На яе месцы была ўзведзена **сінагога** (апошняя існавала яшчэ да Другой сусветнай вайны), а новая **царква** пабудаваная збоку ад цэнтра — дзе зараз знаходзіцца больш позняя праваслаўная бажніца.





Планы царквы 1853 і 1864 гг., адзіныя, якія захаваліся

## «Дванаццаты з яго вайною год...»

Далейшая гісторыя Зембіна не менш цікавая, але і не менш трагічная. Перш за ўсё гаворка пра нашэсце французаў на нашу зямлю. І з гэтага месца перарву храналагічны ланцуг аповеду з тым, каб засяродзіць увагу чытача на падзеях 1812 г., асабліва ў дачыненні да мястэчка, больш падрабязна. З гэтай мэтай і аддаю некалькі старонак Аляксандру Балябіну — даследчыку і нястомнаму папулярызатару гісторыі барысаўскага края, які, дарэчы, быў маім сааўтарам кнігі «Лошница» ў 2018 г.

Перад усім у сваім эсэ Аляксандр Анатольевіч дае магчымасць акунуцца ў атмасферу, што панавала ля заходніх межаў Расіі перад вайной, а з яе пачаткам і на Барысаўшчыне.

*Селение Зембин пересекал Виленский тракт — стратегически важная военная дорога Вильно (Вильнюс) — Сморгонь — Молодечно — Плещеницы — Борисов.*

*…Весной 1810 г. в России был разработан план на случай войны с Францией: составлены подробные топографические планы местности в районе Зембина (у села Веселово) и города Борисова. Концентрация наполеоновских войск у западных границ России вынудила военное ведомство поспешить с постройкой укреплений. Зимой 1812 г. с одобрения царя Александра I были отданы некоторые распоряжения относительно сооружения крепости в междуречье Гайны и Березины.*

*Он также согласился «на устройство дороги от Борисова до Зембина через деревню Большую Стахову». Однако ее возведение отложили, а вскоре вовсе признали нецелесообразным. С наступлением весны началось строительство борисовского тет-де-пона, призванного сдержать продвижение вероятного противника по Московскому тракту к Смоленску…*

*24 июня 1812 г. войска Великой армии, возглавляемые Наполеоном, перешли российскую границу. Передовые части Великой армии заняли Зембин 11 июля (по старому стилю 30 июня).*

*Борисовский уезд был переименован в Борисовскую подпрефектуру, а 11 ключей уезда (ключ — административно-хозяйственный комплекс, состоящий из деревень и фольварков, в государственном или частном владении на территории Беларуси в XVII–XIX вв.) получили названия кантонов.*

*Гражданское правление Борисовской подпрефектурой осуществлялось Комиссией во главе с комиссаром. В каждый кантон из местной шляхты были назначены подкомиссары, представители Комиссии, а если центр кантона имел статус местечка, как Зембин, то и полицейские комиссары.*

Зембинский кантон возглавил подкомиссар Ф. Сержпутовский, общий надзор осуществлял подкомиссар К. Лиходзиевский (владел винным откупом в местечке). В обязанности подкомиссара входило исполнение многочисленных распоряжений, предписаний и требований военных и гражданских властей: заготовка и поставка на провиантские склады продовольствия и фуража, обеспечение всем необходимым маршевых воинских частей, контроль за выполнением населением различных повинностей, соблюдение порядка, поддержание в должном состоянии дорог и мостов, а также многое другое.

Уже 25 июля Зембинский кантон получил разнарядку заготовить в переводе на современные меры веса примерно 64 тонны ржаной муки, более 11 тонн крупы ячменной или гречневой, около 85 тонн овса, 193 тонны сена и соломы, 6 тысяч литров водки, более 1,5 тонны соли. К тоннам и литрам следует приплюсовать 194 вола.

Зембин регулярно пересекали пехотные и кавалерийские части Великой армии, различные отряды, госпитальные и хозяйственные обозы, нередко пополняя в местечке продовольственные и фуражные запасы.

К примеру, в рапорте от 26 июня сообщается о некой команде, присвоившей себе транспорт с провизией и сеном, которые владелец зембинского имения Ф. Хелховский отправил в Борисов. По пути в город транспорт был остановлен, а содержимое реквизировано, причем без выдачи положенной в подобных случаях квитанции. Кроме того, солдаты бесцеремонно выпрягли из возов около десятка лошадей.

В другом рапорте подкомиссар Лиходзиевский жалуется на польских и французских солдат, которых прямо называет мародерами. Чем же заслужили столь обидное прозвище воины цивилизованной Европы? Просто выгребли припасы «до основания», а после, не довольствуясь «добычей», принялись избивать представителя Комиссии.

Тяжким бременем являлось предоставление на разные надобности лошадей и конных подвод.

Зембинский подкомиссар в рапорте от 5 сентября, адресованном членам Комиссии, просил освободить его от поставок 50 подвод. Сержпутовский мотивировал свою просьбу тем, что им недавно было отправлено в Борисов много лошадей. Подкомиссар также сетовал на то, что конные подводы забирают проходящие армейские команды, и не так давно польские солдаты, следовавшие из Вильно в свои полки, реквизировали 14 подобных транспортных средств.



# Пра аўтара

**Анцух Ліліяна Фёдараўна**

Нарадзілася ў Лошніцы Барысаўскага раёна. Скончыла Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А. М. Горкага і Маскоўскі паліграфічны інстытут.

Беларускі выдавец, адна са стваральніц выдавецтва «Чатыры чвэрці», дырэктар з 1993 г.

Член Саюза пісьменнікаў Беларусі, Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы, Прэзідыума Саюза музычных дзеячаў Беларусі.

Аўтар шматлікіх публікацый у кнігах, альбомах, часопісах і газетах. Пры яе асабістым удзеле выходзяць у свет кнігі беларускіх класікаў, выбітных сучасных пісьменнікаў, маладых паэтаў і празаікаў, а таксама альбомы, прысвечаныя беларускай культуры і мастацтву.

За сваю шматгадовую працу ўганаравана высокімі ўзнагародамі: званнем «Лаўрэат прэміі “За духоўнае адраджэнне”» (1996), медалём Францыска Скарыны (2017), медалём Беларускай Праваслаўнай Царквы святой прападобнай Еўфрасінні Полацкай (2018), медалём Максіма Багдановіча Саюза пісьменнікаў Беларусі (2022), нагрудным знакам Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь «Выдатнік друку Беларусі» (2009), нагрудным знакам Саюза пісьменнікаў Беларусі «За вялікі ўклад у літаратуру» (2013), граматай Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі (2014), Архірэйскай граматай (2016), званнем «Лаўрэат конкурсу Беларускага саюза жанчын “Жанчына года-2014”», дыпломамі, падзякамі міністэрстваў і ведамстваў Рэспублікі Беларусь.

# Змест

Звяртаючыся да родных каранёў... *Алесь Карлюкевіч* . . . . . . . . . 5
Пра Зембін — слаўны аграгарадок. *Зіновій Прыгодзіч* . . . . . . . . . 9
Ад аўтара. *Ліліяна Анцух* . . . . . . . . . 13

**ПАДАРОЖЖА Ў МІНУЛАЕ . . . . . . . . . 17**
Жаба, Жабін, Жэбін, Зебін, Зембін . . . . . . . . . 17
Зніклыя выдатнасці . . . . . . . . . 21
«Дванаццаты з яго вайною год...» . . . . . . . . . 31
Час няспынны як рака . . . . . . . . . 41
Нельга забыцца, немагчыма дараваць . . . . . . . . . 48
Пад мірным небам . . . . . . . . . 71

**ДЗЕНЬ ДОБРЫ, ГАРАДОК! Шпацыр па сучасным Зембіне . . . . . . . . . 76**

Да новых сустрэч, Зембін! Замест пасляслоўя . . . . . . . . . 157

Выкарыстаныя крыніцы . . . . . . . . . 159

Пра аўтара . . . . . . . . . 161

# У выдавецтве «Чатыры чвэрці»

выйшлі кнігі

ў серыі «**Малая радзіма. Барысаўскі раён**»:
«**Землякі: вёска Леванова**» (укл.: Л. Ф. Анцух, А. С. Капыток),
«**Лошница**» (Л. Ф. Анцух, А. А. Балябин, М. А. Мательский),
«**Забашавічы**» (укл. Л. Анцух),
«**Мядоцкая “Берагіня” ў прасторы і часе**» (М. А. Козенка);

у серыі «**Малая радзіма. Дзяржынскі раён**»:
«**Навасады**» (А. Стэльмах)









